© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ВОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)

Herausgeber: Wladimir BORTNIK

Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna“ („Das Vaterland“),

(13 b) München 19, Schliessfach 69.

Druck. „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 19, Bothmerstr. 14

Цана: Нямеччына: на год. — 14,— м.; 6 м-цаў — 7,50 м.; 3 м-цы — 4,25 м.; ЗША і Канада: на год — 8,— д.; 6 м-цаў — 4,50 д.; 3 м-цы — 2,50 д.; 1 нумар — 0,20 м. Ангельшчына й Аўстралія: 39 шыл.; 21 шыл.; 12 шыл.; 1 шыл. Бэльгія: 210 фр.; 120 фр.; 75 фр.; 5 фр. Францыя: 800 фр.; 450 фр.; 250 фр.; 20 фр. Аргентына: 80 пэз.; 45 пэз.; 25 пэз.; 2 пэз. Перасылка лётніцкай поштай каштуе падвойна. Падвойныя нумары каштуюць падвойна. Паадзіночныя нумары газэты разам з «Каласкамі» ўважаюцца за падвойныя.

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

Банковае конто: Zeitung „Baćkauščyna“, Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE BELORUSSIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“

№ 49 (533) Нядзеля, 11-га сьнежаня 1960 ГОД ВЫДАНЬНЯ 14

Савецка-кітайскія разыходжаньні

Роўна тры тыдні (ад 10-га лістапада да 1-га сьнежаня сёлета) трывала апошняя канфэрэнцыя кіраўнікоў камуністычных партыяў у Маскве, у якой прыймалі ўдзел 81 дэлегатаў з цэлага сьвету. Ужо такое доўгае трываньне канфэрэнцыі было вымоўным довадам таго, што разыходжаньні паміж савецкімі й кітайскімі камуністымі, зьліквідаваньне або прынамся злагаджэньне якіх было адным із заданьняў канфэрэнцыі, зьяўляюцца ўзапраўды вялікія й скамплікаваныя.

Падобныя камуністычныя канфэрэнцыі на найвышэйшай узроўні, як прыкладам такая-ж канфэрэнцыя ў Маскве ў лістападзе 1957 году або ў Букарэшце ў чэрвені 1960 году, звычайна трывалі ўсяго пару дзён, на якіх аўтаматычна прыймаліся загадзя прыгатаваныя пастановы й абвяшчаліся крыклівыя й энтузіястычныя камунікаты аб дасягненьні поўнае згоды ў найважнейшых пытаньнях, што стаялі на парадку дня.

Апошняя камуністычная карфэрэнцыя на найвышэйшай узроўні ня толькі доўгім часам свайго трываньня розьнілася ад усіх папярэдніх канфэрэнцыяў, але й тым — і гэта галоўнае — што ня была дасягнутая згода ў важных пытаньнях, якія датычаць савецка-кітайскіх ідэялягічных і тактычных разыходжаньняў. З кароткага камунікату, абвешчанага агенцыяй ТАСС 1-га сьнежаня сёлета, даведваемся наступнае:

«Удзельнікі канфэрэнцыі абмяняліся дазнаньнямі й абзнаёміліся ўзаемна із сваімі паглядамі й пазыцыямі. Яны абмяркоўвалі важныя праблемы сучаснага міжнароднага разьвіцьця й камуністычнага руху ў інтарэсах супольнага змаганьня й супольных мэтаў — міру, дэмакрацыі, нацыянальнай незалежнасьці й сацыялізму — і аднагалосна прынялі дэклярацыю камуністычных і работніцкіх партыяў, а так-жа заклік да ўсіх народаў сьвету. Абмяркоўваньне ўсіх пытаньняў адбывалася ў атмасфэры братняй прыязьні на базе нязьменных прынцыпаў марксізму-ленінізму».

Як бачым, камунікат сьцьвярджае, што ўсе пытаньні, якія стаялі на парадку дня канфэрэнцыі, адно абмяркоўваліся «ў атмасфэры братняй прыязьні», але ані словам не ўспамінае, што гэтыя «пытаньні» былі разьвязаныя ці ўзгодненыя. Поўная адсутнасьць такога сьцьверджаньня зьяўляецца вельмі сымптаматычнай. Гэта вымоўна сьветчыць аб тым, што згода ў найважнейшых праблемах і разыходжаньнях між Масквой і Пэкінам, якія заіснавалі ўжо даўно і, у залежнасьці ад палітычнай каньюнктуры, раз завайстраліся, іншым разам лагаднелі, **ня была дасягнутая.** У працяўным выпадку такая згода была-б у камунікаце спэцыяльна заакцэнтаваная і вакол гэтага ўзгодненьня было-б паднята шмат прапагандовага шуму.

У камунікаце гаворыцца, што ў выніку канфэрэнцыі была падпісаная ўдзельнікамі супольная дэклярацыя, якая абыймае 50 бачынаў машыновага пісьма, і заклік да народаў сьвету. У мамэнт пісаньня гэтага артыкулу абодвы ўспомненыя дакумэнты ня былі яшчэ абвешчаныя. Ход самой канфэрэнцыі быў заслонены срогай тайніцай. Але спасьцярогі заходніх карэспандэнтаў і асабліва галасы камуністычнай прэсы ў пэрыяд адбываньня канфэрэнцыі даюць некаторае ўяўленьне аб тым, у якіх пытаньнях зарысаваліся або дакладней паглыбіліся разыходжаньні між Масквой і Пэкінам.

Галоўным ідэялягічным разыходжаньнем між Савецкім Саюзам і Кітаем ад даўжэйшага часу зьяўляецца праблема пабудовы камунізму.

Савецкія камуністыя станоўча абараняюць становішча, што ад капіталізму нельга перайсьці беспасярэдня да камунізму, бо паміж гэтымі дзьвюма фазамі павінна быць яшчэ пераходная фаза — фаза сацыялізму, і ілюструюць усе гэтыя працэсы на прыкладзе гісторыі разьвіцьця Савецкага Саюзу. Гэтак на працягу даўжэйшага часу ў Савецкім Саюзе адбываўся працэс пабудовы сацыялізму, які, паводля савецкіх тэарэтыкаў, ужо закончыўся, і толькі цяпер Савецкі Саюз уступіў у фазу пабудовы камунізму.

Кітайскія камуністыя, наўсуперак савецкім тэарэтыкам, цьвердзяць, што ад капіталізму можна перайсьці адразу да камунізму, абмінаючы фазу сацыялізму. На пацьверджаньне магчымасьці й правільнасьці такога працэсу яны паклікаюцца на разьвіцьцё падзеяў у камуністычным Кітаі. Там, як ведама, ужо ў 1958 годзе былі створаныя г. зв. «народныя камуны», у якіх было сказармаванае ўсё сельскае насельніцтва гэтае вялізарнае краіны паводля ўсіх прынцыпаў, абавязваючых камуністычнае грамадзтва.

Такая інтэрпрэтацыя кітайскага камунізму зьяўляецца для савецкіх камуністых немагчымай да прыняцьця, бо, у працяўным выпадку, гэта абазначала-б, што Кітай на працягу ўсяго дзесяцёх год змог пабудаваць у сябе камунізм, чаго Савецкі Саюз не патрапіў зрабіць на працягу сарака трох гадоў свайго існаваньня. Таму ў сваіх выказваньнях на гэтую тэму, а так-жа ў сваіх афіцыяльных лёзунгах на кажнае 1-га травеня й на гадавіны кастрычніцкай рэвалюцыі савецкія камуністыя гавораць аб Кітаі, як аб краіне, якая будуе сацыялізм, падобна як Альбанія ці Ўсходняя Нямеччына, тады калі аб Савецкім Саюзе гавораць, як аб краіне, якая пабудавала ўжо сацыялізм і ўступіла ў фазу пабудовы камунізму.

Што гэтая праблема жыва дыскутавалася на маскоўскай канфэрэнцыі, пасярэдна сьветчаць галасы заходняе й камуністычнае прэсы. Гэтак, як падае амэрыканскі тыднёвік «Ньюс Уік», прэзыдэнт камуністычнага Кітаю Лью-Шао-Чы ў сваей чатырохгадзіннай прамове на канфэрэнцыі правёў абарону мэтазгоднасьці кітайскіх «народных камунаў» наўсуперак савецкай афіцыйнай тэзе, што камунізм павінен спачатку прайсьці праз фазу сацыялізму. У гэтым пытаньні, як і ў іншых спрэчных пытаньнях, прадстаўнікі камуністычных партыяў Альбаніі, Чэхаславаччыны й Усходняй Нямеччыны, а так-жа паўдзённа-амэрыканскіх краінаў Вэнэцуэлі, Чылі, Уругваю й Аргентыны, згодна інфармацыяў заходніх карэспандэнтаў, падтрымлівалі кітайскія тэзы. Бальшыня, аднак, камуністычных партыяў выказалася за становішчам Савецкага Саюзу.

У вапошнім нумары воргану камуністычных партыяў «Пытаньні міру й сацыялізму», што выдаецца ў Празе, у артыкуле савецкага аўтара Собалева знаходзім асуджэньне кітайскіх «народных камунаў», прычым там цьвердзіцца, што ў паходзе да камунізму нельга абмінуць фазы сацыялізму.

Наступным пытаньнем, вакол якога трываюць ад даўжэйшага часу прынцыповыя разыходжаньні між савецкімі й кітайскімі камуністымі, зьяўляецца пытаньне стратэгіі й тактыкі камунізму ў ягоным паходзе на апанаваньне цэлага сьвету. Савецкія камуністыя, паклікаючыся на пастановы маскоўскай камуністычнай канфэрэнцыі ў лістападзе 1957 году й маскоўскі «Маніфэст міру» з таго-ж 1957 году, у якіх абараняўся прын-

(Заканчэньне на 2-ой бач.)

Пытаньне каляніялізму ў ЗН

Да мамэнту напісаньня гэтых радкоў Генэральная Асамблея ЗН ў Нью Ёрку ўжо тыдзень правяла над абмеркаваньнем «каляніяльнага пытаньня».

Як ведама, гэтую праблему ўзьняў Хрушчоў у часе сваіх апошніх «выступленьняў» у Нью Ёрку, паставіўшы дамаганьне разгледзець на бягучай сэсіі Генэральнай Асамблеі ягоную прапанову аб безадкладнай ліквідацыі каляніялізму і прызнаньні незалежнасьці ўсім народам, паняволеным імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Ставячы гэтую праблему на абмеркаваньне гэтага найвышэйшага міжнароднага воргану, Хрушчоў зусім відавочна спадзяваўся выклікаць да сябе сымпатыі, а да Захаду варожасьць з боку прадстаўнікоў маладых краінаў Афрыкі і Азіі, а таксама выклікаць і падмацаваць прокамуністычныя і антыамэрыканскія настроі ў краінах Лацінскай Амэрыкі. Гэта яму было пільна патрэбна асабліва дзеля таго, што, напрыклад, падрыхтоўка «рэвалюцыйных» пераваротаў у Цэнтральнай і Паўдзённай Амэрыцы, як паказалі падзеі мінулага тыдня, праводзілася пры дапамозе рэжыму Кастра на Кубе ўжо ад даўжэйшага часу і гэтыя выступленьні былі заплянаваныя ў шырокім маштабе.

Аднагалосная згода ўсіх дзяржаваўсяброў ЗН паставіць на парадак дня сэсіі Генэральнай Асамблеі абмеркаваньне запрапанаванага Хрушчовам каляніяльнага пытаньня зьдзівіла, як выглядае, і самога Хрушчова. На думку заходніх палітычных камэнтатараў, заходнія дзяржавы ў прапанове Хрушчова пабачылі добрую нагоду, каб паказаць непаінфармаваным або малапаінфармаваным і не заўсёды ўстойлівым перад дэмагагічнай бальшавіцкай прапагандай палітычным лідэрам новаствораных дзяржаваў імпэрыялістычную і каляніятарскую сутнасьць чырвонае Масквы.

Аб канчатковых выніках абмеркаваньня пытаньня каляніялізму можна будзе гаварыць пасьля заканчэньня дэбатаў над гэтым пытаньнем. Тады можна будзе рабіць падсумаваньне, хто — Захад ці Ўсход — лепш выкарыстаў гэтую рэдкую й важную нагоду. Цяпер мы коратка разгледзім, што здарылася да гэтага часу, а таксама некаторыя суправаджальныя акцыі, праводжаныя ў сувязі з гэтым абодвымі бакамі.

Узьняцьце пытаньня каляніялізму зьяўляецца надзвычай важным таму, што ўвесь сьвет змог урэшце наглядна пераканацца, дзе хаваецца найбольш балючае і найбольш слабае месца бальшавіцкай сыстэмы. Пры ніякай іншай, навет найбольш важнай міжнароднай праблеме, камуністычныя кіраўнікі не рэагавалі так чула й войстра, як пры прыгадваньні аб існаваньні савецкага ці, больш дакладна, расейска-бальшавіцкага каляніялізму й імпэрыялізму. Прыгадваньне савецкага каляніялізму на форуме Задзіночаных Нацыяў прыводзіла да шаленства Хрушчова. Такую-ж рэакцыю — стуканьне кулакамі па стале і спроба за ўсякую цану перарваць выступленьне прамоўцы — выклікала выступленьне прадстаўніка Англіі Ормсбі-Гора на пачатку цяперашняга разгляду каляніяльнага пытаньня, калі апошні заатакаваў маскоўскі каляніялізм.

Выступленьне ангельскага прадстаўніка Ормсбі-Гора заслугоўвае на асаблівую ўвагу ў сувязі з тым, што Англія звычайна бывае вельмі асьцярожнай у дачыненьні да ўсяго таго, што падпадае пад рубрыку гэтак званага «ўмешваньня» або «няўмешваньня» «ў нутраныя справы іншай дзяржавы». Ведаючы гатовасьць ураду Макміляна шукаць кампрамісаў з маскоўскімі валадарамі, войстрае і рашучае выступленьне Ормсбі-Гора адначасова і зьдзіўляе і напаўняе аптымізмам.

Адзначыўшы, што прадстаўнікі 500 мільёнаў народу, якому Англія ад 1939 году прызнала незалежнасьць, зьяўляюцца прысутнымі цяпер на Генэральнай Асамблеі, Ормсбі-Гор гаварыў, што за гэты самы час шэсьць краінаў з 22 мільёнамі насельніцтва былі сілай улучаныя ў Савецкі Саюз; у іхным ліку тры найнавейшыя калёніі сьвету: Літва, Латвія й Эстонія. «Апрача таго, — сказаў Ормсбі-Гор, — Савецкі Саюз ажыцьцяўляе эканамічную, палітычную й мілітарную дамінацыю над мільёнамі іншых мужчын і жанчын у суседніх краінах.»

Ормсбі-Гор гаварыў далей:

«Нязьлічоныя высілкі былі робленыя нацыянальнымі рухамі ў краінах пад расейскім кантролем з мэтай здабыцьця незалежнасьці. Усе яны былі здушаныя.»

Ормсбі-Гор закрануў савецкую каляніяльную палітыку ў Цэнтральнай Азіі, пералічыўшы масавыя дэпартацыі насельніцтва і ліквідацыю цэлых нацыянальнасьцяў. Ён прыгадаў скасаваньне гэтак званых аўтаномных рэспублікаў Немцаў Паволжа, Крымскіх Татараў, Калмыкаў, Чэчэна-Інгушаў і іншых.

Дарэчы тут будзе прыпушчэньне, што гэтае выступленьне Ормсбі-Гора ў пэўнай ступені можна заўдзячваць ягонай уласнай ініцыятыве, бо ён добра азнаёмлены з нацыянальнымі праблемамі ў Савецкім Саюзе. Прыгадаем, што Ормсбі-Гор, да часу пакліканьня яго на становішча дзяржаўнага міністра, быў ганаровым старшынёй Беларуска-Ангельскага Таварыства, заснаванага ў Лёндане на ініцыятыву новай беларускай эміграцыі. Гэта, бязумоўна, дало яму нагоду бліжэй пазнаёміцца з праблемамі паняволеных Масквой народаў.

У змаганьні навокал праблемы каляніялізму савецкі блёк, адгнаны на абаронныя пазыцыі, супраціўляецца як можа, ужываючы ўсе даступныя яму прапагандовыя аргуманты й мэтады. Высіл-

(Заканчэньне на 2-ой бач.)

Сёе-тое

Амэрыканскі часапіс «Лайф» за 14-га лістапада цьвердзіць, што Амэрыканцы ў Задзіночаных Нацыях павінны паставіць у шырокім сьвятле справу савецкага каляніялізму, але... абмежавацца адно да Вугоршчыны. Гэтая краіна, паводля часапісу «Ляйф», ёсьць найбольш яскравым прыкладам брутальнага савецкага каляніялізму.

Вугорскае паўстаньне яшчэ сьвежае ў памяці вольных людзей. Народы сьвету з агідаю прыгадваюць савецкі барбарскі злачын супраць вугорскага народу. Але ці-ж льга ня прыгадаць далі Беларусі, Украіны, балтыйскіх дзяржаваў і дзесятку іншых, што ўжо дзесяцігодзьдзямі церпяць пад расейскім прыгнечаньнем толькі таму, што іхнае паняволеньне часам далей аддзеленае?

Пытаньне расейска-бальшавіцкага каляніялізму, найбольш жорсткага, цынічнага й крывадушнага, зьвязанага з масавым народавынішчэньнем, трэба паставіць у поўнай шырыні. Адно тады яно будзе мець жаданы эфэкт сярод новых дзяржаваў Афрыкі й Азіі ды прынясе вялікую дапамогу справе вызваленьня паняволеных народаў і ліквідацыі нявольніцкай расейска-бальшавіцкай імпэрыі

*

Амаль у кажным выданьні на першай бачыне менскай «Звязды» можна ўбачыць здымак «героя нашых дзён». Сяньня гэта будзе даярка, заўтра — сьвінарка, іншым разам — электразваршчык, муляр, шахцёр і іншыя. Вымушаныя ўсьмешкі гэтых людзей ня могуць схаваць відавочнай змучанасьці. Гэтак выглядаюць людзі, што намагаюцца ўсьміхнуцца на загад для казённага фатографа, а выразам твару ня могуць утоіць запраўднага беспрадоньня бальшавіцкага прыгону, шэрай нявольніцкай будзённічыны. Прадукцыя іхных мазалёў зьяўляецца асноваю бальшавіцкага Молаха ўдома й расплываецца сокамі на падтрыманьне шчупальцаў маскоўскага актопуса па цэлым сьвеце. Гэта людзі працы, найніжэйшая й найбольшая лікам кляса ў гэтак званым «бясклясавым грамадзтве». Гэта тыя, што ніколі ня бываюць паза засягам сваіх найбліжэйшых ваколіцаў, якіх ад калыскі да магілы шлях вядзе адно праз калгаснае поле або побач хвабрычнае машыны. Гэта іх вечна кормяць крывадушнай прапагандай аб «цудоўным жыцьці» у СССР і галечы за межамі, ад іх старанна й пастаянна хаваюць праўду, бо баяцца іх, як агня, каб не пазналі праўды й ня сталіся вольнымі. Гэта — працоўны беларускі народ.

Ёсьць у БССР іншая кляса: кіруючых і пануючых. Гэта трыманая на маскоўскім павадку верхавінка — партыйцы й бюракраты. Гэтым запраўды жыцьцё цудоўнае. Смокчуць яны сокі народнае прадукцыі й сыцеюць за кошт поту прыгнечаных. Між гэтай клясы, акрамя наўчоных і высокакваліфікаваных людзей, знойдзеце ці не бальшыню таленавітых казёньнікаў-бобікаў. Таленавітасьць іхная, сьціпла гаворачы, вельмі празаічная: зводзіцца да ўмелай паслухмянасьці маскоўскаму гаспадару й аж надмернага віляньня хвастом.

Ясна, ёсьць бобікі менш і больш заслужаныя. Больш заслужаныя дачакаюцца вунь часам і не абы якой ласкі. Гэтак у мінулым годзе Пятрусь Броўка быў дэлегатам на Асамблеі Задзіночаных Нацыяў. Вярнуўшыся назад, адплаціўся сваім дабрадзеям заядлым зьвяганьнем на Амэрыку й новай хваляй глёрыфікацыі нявольніцкага савецкага ладу.

У гэтым годзе ў Канадзе й Амэрыцы пабывалі Янка Брыль і Пімен Панчанка. Турысты Брыль пакуль што нарадзіў адно рэпартар з канадзкіх уражаньняў: «На другім баку планеты», які зь няпрыемным смакам давялося нам стравіць, чытаючы «Беларусь» № 10.

Брыль, зразумела, ня мог напісаць праўды дык падыйшоў да разьвязкі заданьня старой і ўцёртай сьцяжкай: апісаўшы павярхоўна ўражаньні з Монтрэалю й Стратфарду, вывеў на найбольш пачэснае месца самую нікчэмную й палітычна-ігнарантную групку канадыйскіх «прагрэсывістаў». Бальшыню яе, як тут усім ведама, складаюць Украінцы, а мяншыню — іншыя славянскага паходжаньня. Зь яе ў ладнай меры рэкрутуюцца сябры бясьсільнай 27-мітысячнай збанкрутаванай канадыйскай камуністычнай партыі.

І усёткі-ж турысты Брыль ня змог зусім скрыць праўды.

«На схіле мінулага стагодзьдзя дабіраліся сюды з-за акіяна «людзі ў кажухах»... Так пагардліва называлі бязмоўных і безбаронных шукальнікаў хлеба махляры й крывасмокі, што прывозілі іх сюды на палубах і ў трумах грузавых параходаў, а потым былі панамі іх працы і жыцьця»... — пралівае кракадзілавыя сьлёзы партыйны бобік.

І што-ж зь іх высмакталі тыя «махляры й крывасмокі»?

«У нядзелю 24-га ліпеня тут адбываўся так званы акруговы пікнік таронцкіх Украінцаў, а фактычна — мітынг дружбы, на які сабралася тысячы тры народу. На зялёнай паляне і ў засені дрэў, каля ўласных машын, сямейнымі ды зямляцкімі групамі разьмясьціліся яны навокал — рабочыя, фэрмэры, інтэлігенцыя...»

«Людзі ў кажухах» і іхныя дзеці «разьмясьціліся каля ўласных машын». Ці-ж ня вымоўна? Прызнаем. Цяжка тут было. Наслухаешся вунь у волю. І былі такія, што смакталі, але ці-ж гэта такія «махляры й крывасмокі», як тыя, якім служыць і для якіх зьвягае бобік Брыль? Чаму няпрошаны партыйны абаронца цікавіцца тымі, што маюць, паводля яго, «ўласныя машыны»? Чаму-б яму не зацікавіцца людзьмі з падбітымі ад бяссоньніцы й перапрацаваньня вачмі, гэтак званымі «героямі нашых дзён»?

(Заканчэньне на 4-ай бачыне)

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

„Амэрыка, прачніся!“

Ад Рэдакцыі: Пад гэтым загалоўкам у лістападаўскім нумары сусьветнаведамага амэрыканскага месячніка «Reader's Digest» зьявіўся артыкул генэрала Карлёса П. Ромулё — выдатнага філіпінскага палітычнага дзеяча. Карлёс П. Ромулё — ня толькі дзяржаўны дзеяч і вайскавік. Ён таксама выдатны публіцысты — ляўрэат прэміі Пуліцэра, што зьяўляецца найвышэйшым гонарам для журналістага.

Ад 1954 году Карлёс П. Ромулё займае станов шча амбасадара свае краіны ў Задзіночаных Штатах Амэрыкі. Перад гэтым ён быў доўгія гады кіраўніком філіпінскай дэлегацыі ў Арганізацыі Задзіночаных Нацыяў. У 1949 годзе ён быў выбраны старшынём чацьвертай Генэральнай Асамблеі АЗН.

Падчас Другое сусьветнае вайны ён браў актыўны ўдзел у змаганьні супраць японскіх акупантаў, і некалькі разоў быў адзначаны за асабістую мужнасьць у баёх.

Характэрна, што артыкул Карлёса П. Ромулё зьявіўся беспасярэдня перад прэзыдэнцкімі выбарамі ў ЗША; ён быў напісаны спэцыяльна для месячніка «Reader's Digest», які выдаецца ў 16 мовах сьвету, і тыраж якога перавышае 16 мільёнаў паасобнікаў. Мы ўважаем, што беларускае грамадзтва мусіць пазнаёміцца з гэтым палымяным заклікам філіпінскага дзяржаўнага дзеяча да амэрыканскага народу, бо закранутыя ім праблемы беспасярэдня тычацца ўсіх паняволеных камунізмам народаў.

Ніжэй зьмяшчаем у перакладзе першую частку ягонага артыкулу.

*

Савецкі камунізм знаходзіцца цяпер у найбольш дзікай стадыі свае жудаснае кар'еры. Галоўны аб'ект у гэтай стадыі — гэта Задзіночаныя Штаты. Кіраўнік амэрыканскай дзяржавы камуністымі публічна абражаўся, яны тапталі гонар Амэрыкі і бясцырымонна абыходзіліся з амэрыканскімі грамадзянамі ўсюды, дзе толькі камунізм мае сілу ці уплывы. Дактрына Манро, астоя Заходняй Паўкулі, была высьмеяная. Камуністыя здабываюць грунт у Караібскім раёне — пры дапамозе інфільтрацыі зь ня меншай рашучасьцяй, як пры дапамозе збройнай інвазіі.

У вабліччы такой пагрозы і зьнявагаў, чужынец у вашым асяродзьдзі зусім натуральна чакае на рэакцыю — на гнеўны выбух народнага пратэсту. Ён чакае дарэмна. Амэрыканскі народ застаецца на дзіва абыякавым. Навет халоднакроўнае забойства амэрыканскіх лётнікаў ня вырывае яго з гэтай абыякавасьці. Гэткая лагоднасьць найбольшай і ўсё яшчэ наймагутнейшай нацыі на зямлі зьдзіўляе і абезнадзейвае прыяцеляў Амэрыкі ўва ўсім сьвеце. І ў гэтым тоіцца вялікая небясьпека. Мяккасьць заахвочвае агрэсара пайсьці задалёка ў сваіх дзеяньнях, прыбліжаючы тую катастрофу, якой вы хочаце ўнікнуць.

Я цалкам усьведамляю сабе, што лёс мае бацькаўшчыны — Філіпінаў — залежыць ад лёсу Задзіночаных Штатаў. Нэўтралізм не дае аховы супраць камуністычнай экспансіі, аб чым у наш час пераконваецца Індыя. І таму мая краіна ігнаруе чырвоныя пагрозы, і прэзыдэнт Філіпінаў, Парлёс П. Гарсія, з уласнай ініцыятывы запрасіў Задзіночаныя Штаты ўстанавіць ракетныя базы на тэрыторыі нашай краіны. Таму, і з прычыны мае глыбокае прыязьні да вашае краіны, я дазваляю сабе зьвярнуцца да вас зусім адкрыта. Я кажу:

Амэрыка, прачніся! Страсі зь сябе бязьдзейнасьць, якая дае дарогу сілам зла ў гэтым сьвеце. Зразумей неаспрэчны факт, што ты знаходзішся цяпер у стане **запраўднай** вайны, і што ў гэтай вайне трэба змагацца і яе трэба выйграць. Зразумей, што гэта адзіная альтэрнатыва!

Пэрыяд нерашучых поўмерапрыемстваў мінуў. Спадзявацца цудаў — такіх, як зьменаў у крамлёўскім кіраўніцтве ці прыязных перамоваў і разумных умоваў, ці «зьменшаньня напружаньня» — гэта толькі яшчэ глыбей апынацца ў камуністычнай пастцы. Замʼж гэтага, Задзіночаныя Штаты мусяць больш актыўна стаць на чале сьвету ў гэтым змаганьні. Вашая рашучасьць, базаваная на запраўднай сіле характару, зьяўляецца сяньня адзінай гарантыяй вольнага сьвету супраць далейшага пашырэньня савецкай тыраніі. Вашая вера, што ўсе людзі маюць аднолькавае права на жыцьцё, свабоду і шуканьне свайго шчасьця, заўсёды здавалася для ўсіх нас мэтай нацыі, якая натхняла ўсё людзтва і зьяўлялася адказам на прэтэнзіі чырвонага дэспатызму. Калі цяпер, праз сваю апатыю і абыякавасьць, вы пахісьнецеся ў вашай адданасьці гэтым ідэялам людзкой свабоды, дык няма сумлеву, што чорны век камуністычнага таталітарызму праглыне людзкі род.

Калі мы возьмем ступень росту камуністычнай паліцыйнай дзяржавы пасьля другой сусьветнай вайны, дык камунізм можа запанаваць ува ўсім сьвеце яшчэ пры нашым жыцьці. Ці гэта гучыць як перабольшаньне? Што-ж, старажытныя Рымляне таксама ўважалі, што заваяваньне іх **іхнымі** барбарамі было непраўдападобным. У нашыя часы гісторыя рухаецца з электроннай хуткасьцяй. Працэсы, якія ў старажытныя часы займалі стагодзьдзі, цяпер выбухаюць у дзесяцігодзьдзях. Хто мог падумаць пакаленьне таму, што камунізм будзе хутка стаяць на двух кантынэнтах, ад Балтыцкага мора да Ціхага акіяну, з сваімі галінамі ў такіх далёкіх месцах як Афрыка ці Караібскі раён?

Бязумоўна, кажнаму мусіць быць ясна, што Расея імкнецца да апанаваньня сьвету. Гэткім-жа ясным мусіць быць тое, што ейным кіраўніком нельга верыць. Але хто сумляваецца ў тым, што калі Крэмль зноў пастановіць пачаць «мяккую» палітыку, дык ізноў шмат хто з нас будзе балбатаць пра «новыя павевы» ў Расеі, віншуючы сябе з новымі цудоўнымі шансамі на «мірнае суіснаваньне», і цешачыся ілюзіяй, што «халодная вайна» вось-вось і скончыцца?

Сумная праўда — гэта тое, што камуністыя маюць кантроль над тэрмастатам пачуцьцяў вольнага сьвету, падкручва-

(Заканчэньне на 3-яй бачыне)

Савецка-кітайскія разыходжаньні

(Заканчэньне зь 1-ай бач.)

цып мірнага суіснаваньня, цьвердзяць, што сілы міру ў цэлым сьвеце настолькі ўзрасьлі й перавышаюць ужо сілы вайны, што камунізм мае ўсе дадзеныя здабыць поўную перамогу над капіталізмам мірным шляхам. Затое кітайскія камуністыя, хаця ў вапошнім часе таксама пачалі заяўляць аб магчымасьці перамогі камунізму мірным шляхам, не адкідаюць, аднак, і неабходнасьці вайны з капіталістычнымі дзяржавамі. Выходзячы з такога гледзішча, яны асуджаюць прапагаваную Саветамі палітыку мірнага суіснаваньня й дамагаюцца больш войстрага курсу ў дачыненьні да Захаду. Гэтак кітайская камуністычная прэса нядаўна перадрукавала асьветчаньне альбанскай дэлегацыі супраць савецкай палітыкі «выжаброўваньня ў капіталістых міру». У сувязі з гэтым асьветчаньнем кітайскі прэм'ер Чу-Эн-Ляй заявіў, што кітайскія камуністыя зьяўляюцца гордымі із сваіх «альбанскіх таварышаў па зброі».

Трэйцяе галоўнае вогнішча савецка-кітайскіх разыходжаньняў датычыць ролі абедзьвюх дзяржаваў у камуністычным блёку й сьветавым камуністычным руху. Кітайскія камуністыя афіцыяльна вызнаюць вядучую й кіраўнічую ролю Савецкага Саюзу ў сьветавым камуністычным руху, але ў ніякім выпадку не згаджаюцца, каб Кітай знаходзіўся ў палажэньні сатэліты Савецкага Саюзу. Як падае ўспомнены «Ньюс Уік», прэзыдэнт камуністычнага Кітаю Лью-Шао-Чы на маскоўскай канфэрэнцыі абвінаваціў Хрушчова ў тым, што ён стараецца адбудаваць «культ адзінкі» й намагаецца камуністычны Кітай падпарадкаваць Савецкаму Саюзу. Кітайскія камуністыя, згаджаючыся на савецкае кіраўніцтва сьветавым камуністычным рухам, хочуць, аднак, мець на гэтае кіраўніцтва й свой бясспрэчны ўплыў і патрабуюць, каб Савецкі Саюз сур'ёзна лічыўся зь іхнымі патрабаваньнямі ў пытаньнях стратэгіі й тактыкі камунізму.

Апрача разыходжаньняў ідэялягічнага характару, на маскоўскай канфэрэнцыі ўзьніклі таксама непаразуменьні ў справе стварэньня новага камінформу. Прадстаўнікі кітайскіх камуністых выказвалі сваё незадаваленьне яшчэ ў сувязі з тым, што коштам зьмяншэньня гаспадарскай дапамогі сваім верным саюзьнікам у Паўдзённа-Ўсходняй Азіі Савецкі Саюз прызнае вялікія крэдыты й дае тэхнічную помач Індыі й іншым нэўтральным краінам.

Як ведама, многія заходнія палітыкі песьцяць у сабе надзею, што савецка-кітайскія ідэялягічныя й тактычныя разыходжаньні пры спрыяльнай для Захаду каньюнктуры могуць выліцца ў сур'ёзны канфлікт, які ў сваю чаргу настолькі будзе абсарбаваць сілы і ўвагу абодвых камуністычных праціўнікаў, што яны перастануць быць грознымі для Захаду. Мы, аднак, ніколі не падзялялі падобных ілюзіяў, уважаючы, што савецка-кітайскія спрэчкі ня могуць зайсьці аж так далёка, каб ня быў знойдзены патрэбны для абодвых бакоў кампраміс. Камуністычны Кітай ня можа пайсьці дарогай югаслаўскіх камуністых, бо ня можа абыйсьціся без савецкай гаспадарскай і тэхнічнай помачы, безь якой гэтак жыцьцёва важная справа індустрыялізацыі Кітаю асталася-б ніколі ня зрэалізаванай.

З другога боку, і Савецкі Саюз ня можа абыйсьціся без салідарнага падтрыманьня камуністычнага Кітаю ў ягоных канцэпцыях і практыцы міжнароднае палітыкі. Чым большае знаходзіць Крэмль падтрыманьне ў Пэкіне, тым больш эфэктоўным становіцца курс савецкай вонкавай палітыкі.

Савецка-кітайскія разыходжаньні, якія гэтак моцна завайстрыліся на маскоўскай канфэрэнцыі, з усей пэўнасьцю будуць мець адзін вынік, ня вельмі прыемны для Захаду: Савецкі Саюз будзе змушаны больш лічыцца із сваім кітайскім партнэрам, чымся лічыўся дагэтуль. Іншымі словамі, ідучы на пярэймы пэкінскім патрабаваньням, Саветы будуць змушаныя значна больш завайстрыць свой палітычны курс у дачыненьні да Захаду.

Язэп Каранеўскі

Пытаньне каляніялізму ў ЗН

(Заканчэньне зь 1-ай бач.)

кі неяк абараніць сваю нацыянальную палітыку заўважаюцца, напрыклад, у значнай актывізацыі прадстаўніцтва БССР пры ЗН. Калі раней прадстаўнікоў БССР савецкая дэлегацыя выпускала на трыбуны ЗН толькі ў рэдкіх выпадках — цяпер палажэньне прыкметна зьмянілася. Кіраўнік дэлегацыі Кісялёў выступае з прапагандовымі прамовамі на канфэрэнцыі ЮНЭСКО і ваюе там за правы — каго-б вы думалі? — Кітайцаў... Сябра дэлегацыі Гурыновіч выступае ў Эканамічнай і Сацыяльнай Радзе ЗН у вабарону ўсяго «сацыялістычнага лягеру». Іншыя сябры дэлегацыі шумяць таксама ў камісіях і падкамісіях ЗН.

Нябывалая рэч! Вяршыняй-жа ўсёй шуміхі трэба, хіба, уважаць прыняцьце, якое наладзіў 16 лістапада Кісялёў для ўдзельнікаў цяперашняй сэсіі Генэральнай Асамблеі. Калі верыць беларускай савецкай прэсе, на прыняцьці прысутнічала больш пяцісот чалавек.

Прадстаўніцтву БССР пры ЗН дасюль чамусьці не хапала сяродкаў і энтузіязму, каб выдаць, напрыклад, якую-небудзь больш менш грунтоўную брашуру зь інфармацыяй пра сваю краіну. Гэтыя «прадстаўнікі» «не заўважаюць», што ў выданьнях ЗН гаворыцца, быццам беларускі народ ня мае свае ўласнае мовы, а карыстаецца мовай расейскай. Яны надзвычай актыўна пачалі бараніць эканамічныя й нацыянальныя інтарэсы Кітайцаў, Кубінцаў, Арабаў, Нэграў і іншых ад гэтак званай каляніяльнай эксплятацыі з боку «заходніх імпэрыялістых», але, што пры савецкай уладзе жыцьцёвы ўзровень беларускага народу застаўся адным з найніжэйшых у Эўропе і, фактычна, раўняецца ўзроўню слабаразьвітых краінаў, — яны таксама «не заўважаюць». Але шумяць!..

Ня можа быць ніякага сумлеву, што гэтая «актыўнасьць» прадстаўнікоў БССР загадзя заплянаваная Крамлём, каб выканаць акрэсьленае заданьне. Зусім відавочна таксама, што гэтае заданьне палягае ў тым, каб прадэманстраваць, што дэлегацыя савецкай саюзнай рэспублікі — у гэтым выпадку БССР — карыстаецца «дыпляматычнай незалежнасьцяй» і «свабоднай ініцыятывай» і што рэпрэзэнтаваная ёй краіна мае быццам нейкую палітычную аўтаномію.

Аднак усе гэтыя трыкі не далі бальшавіком пажаданых вынікаў. Шматслоўныя прапагандовыя тырады Хрушчова, Падгорнага, Мазурава, кісялёвых ды гурыновічаў не пераканалі прадстаўнікоў маладых народаў, што СССР гэта ня імпэрыя, а БССР, напрыклад, — гэта быццам незалежная дзяржава. Адным з доказаў гэтага зьяўляецца тое, што яны адкінулі савецкую фармулёўку рэзалюцыі ў каляніяльным пытаньні і падалі свой праект, сфармуляваны больш агульна, дзе пад каляніяльнай дзяржавай можна разумець кажную запраўды каляніяльную сыстэму, у тым ліку, а магчыма і ў першую чаргу, і Савецкі Саюз. Нядаўняе вэта савецкага прадстаўніка супраць прыняцьця ў сябры ЗН найнавейшай афрыканскай незалежнай дзяржавы — Маўрытаніі разглядаюць на Захадзе, як расчараваньне камуністычнага кіраўніцтва пастановай лідэраў новых дзяржаваў Афрыкі і ўскоснае прызнаньне банкроцтва свае палітыкі шырокай камуністычнай экспансіі на гэты кантынэнт.

Ніхто, хіба, не адважыцца аспрэчваць, што выкрыцьцё расейска-бальшавіцкага імпэрыялізму і каляніялізму адыграла ў гэтым першарадную ролю. Таму Захад павінен быў-бы цяпер канчальна сабе ўсьведаміць, што ў гэтым кірунку трэба йсьці больш цьвёрда й рашуча. Калі абмеркаваньне каляніяльнага пытаньня на сэсіі ЗН яшчэ працягнецца, прадстаўнікі заходніх дзяржаваў будуць мець добрую нагоду занесьці на сваё конта яшчэ больш удачаў і паставіць гэтым рашучы крок наперад у кірунку перамогі свабоды й дэмакратыі ўва ўсім сьвеце.

М. Кручкоўскі

Творы Алеся Гаруна

Матчын дар

(Працяг)

ІВАНКУ

Слухай, Іване, паночку,
Кепска ты робіш, браточку!
Хіба-ж ня сорам так жыць,
Гэткім нядбайлівым быць?

Глянь навакол на суседаў,
Некалі добра іх ведаў:
Хто зь іх спусьц.ўся, як ты,
Мае з тваёй беднаты?

Хіба-ж яны галадуюць,
Хіба-ж патвойму бядуюць?
У іх і апратачка ёсьць,
Часам пракорміцца й госьць.

Гэта-ж, дзе людзі зьбяруцца,
Зараз зь цябе пасьмяюцца,
Кажуць: «Гультай, абібок».
Так яно, мой галубок!

«Бацька яго ў гаспадарсьцьве
Быў, як-бы цар у сваім царсьцьве.
Быў ў гаспадарачцы лад,
Вока было і дагляд...

Быў чалавек яго татка!
Ён-жа, — дзівіся: апратка
Ў дзірках, у гнідзе, сьцьвіла,
Ў хаце — трава абыйшла.

Нейкае дзіва дый годзе!» —
Жарты часамі ў народзе: —
«Моцны гультай, моўся вол,
К працы-ж прыгнаць — трэба кол».

Чуеш ты, чуеш, Іванку,
Што у людцоў за гуканка?
Слухай, над кім гэты сьмех?
Грэх табе, братачка, грэх!.

* * *

Ты, мой брат, каго зваць Беларусам,
Роднай мовы свае ня цурайся;
Як ня зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся.

Ад дзядоў і ад прадзедаў, браце,
Гэта скарб нам адзін захаваўся, —
У сялянскай зрабованай хаце
Толькі ён незабраны застаўся.

А даўней Беларус, непадданы,
Гаспадарыў, быў сам над сабою
І далёка у сьвеце быў знаны
За літоўскай і ляскай зямлёю,

Але час прамінуў, і нядоля
На народ як-бы камень зваліла;
Беларуская слава і воля
Адыйшла, адцьвіла, адсьвяціла.

Не зьмяняючы шэрай апраткі
Працаваў ты, як вол, гаратліва,
А у хаце тваёй недастаткі,
А на ніве тваёй неўрадліва.

А чаму? Ты няздольны, ці хворы,
Ці благі гаспадар, ці п'яніца?
Мусіць не! Бо-ж і іншым упору
У цябе гаспадарыць наўчыцца.

Сьветлы розум твой, брат, але дзетак
Ад цябе, як і ўсё, адбіралі
І на бацькаўскі родны палетак
Працаваць-памагаць ня пушчалі.

Хто хацеў, той і сьмеў рабаваці,
Бяз прыпросу зьяжджаліся госьці —
Абдзіраць, аб'ядаць, абпіваці
І крышыць гаспадарскія косьці.

Можа-б ты і памёр і загінуў,
Каб ня вешчая мова Баяна.
Хто-ж быў добры, яе хоць пакінуў?
Як-жа так, што яшчэ не забрана,

Бо што бачылі госьцікі-гэрцы —
І зямлю, і лясы, і кілімы, —
Ўсё забралі, а мову у сэрцы,
Ў сваім сэрцы хавалі-нясьлі мы.

Дык шануй, Беларус, сваю мову —
Гэта скарб нам на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацьце-народы!

1910—1917

ЮДАМ

Да вас, паны, што голасна крычэце
Аб прыязьні сваёй да «беднага народу»,
Што раіце палісьсяму: «Маўчэце,
«Мы волю вам»... Пракляцьце вам ізь ёю!
Нядоўга вам дадзём багацьце, волю,
згоду», —
Да вас мой гэты верш і словы ўсе благія,
Бо словам вы адны, а справамі — другія.

«Багацьце вам»... Няма вам нашай веры!
Бо ў той-жа год ліхі, што ў полі не
ўрадзіла,
Галоднаму на прокарм хлеба меры
Аднэй вы не далі і злаялі няміла...

Калі для нас жадаеце багацтва,
Нашто зь бяздольнага зьдзіраеце апратку?
Нашто-ж тады вы плодзіце жабрацтва,
Дамы пустошачы бязь ліку, без астатку?

Чаму ад волі вашай мы стагнаць павінны?
Яна — ланцуг над нашаю зямлёю,
Астрог на наш народ спакойны
і бязьвінны.

Ня воля гэта! Што нам не цьвярдзеце,
Мы вольнымі былі за даўнымі часамі.
Ідзеце-ж проч! І з воляю ідзеце!
Да волі знанае хутчэй мы прыйдзем самі.

«Мы згоду вам»... Пакіньце ашуканства!
Вы — бойкі братняе чарнейшыя прарокі,
Бяз звады вам, нашэптаў, падтыканства
Нямілы Божы сьвет, ні ясны, ні шырокі.

Ня просім вас! ня трэба вашай згоды!
Сваё вялікае, дзядоўскае багацьце
Хаваем мы; ад Бога ўсе народы
І бацькі аднаго ўсе дзеці, людзі — брацьце.

Адкуль вы к нам? Якога племя, роду?
Зь якіх краёў прыйшлі бяз праўды і бяз
сэрца?
І што вам з нас, ад нашага народу?
Чаму так зычыце яму хутчэй памерці?

Га! Знаем вас, атручаньня найміты:
Вы — служкі чорныя Ясьнейшага Мамона,
Вы — мора бруд, ля берагу намыты,

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Сьвежае, а так старое

(Працяг з нумару 43)

Раней, як прыступіць да апісаньня паходу маскоўскіх войскаў на Ноўгарад, я дазволю затрымацца на хвіліну, каб пазнаёміць чытачоў з маскоўскім тагачасным грамадзтвам і баярствам. Найлепшым судзьдзёй і найлепшай характарыстыкай будзе, калі прывяду апінію шырока ведамага й папулярнага расейскага гісторыка, праф. В. О. Ключэўскага, бо калі-б паклікаўся на нейкага іншага гісторыка, дык гатовыя яму й мне закінуць тэндэнцыйнасьць. Вось-жа, паслухаем, што кажа праф. Ключэўскі:

...«Татары былі, у дачыненьні да паняволенай імі Русі, як сяродак дапамогі й аблягчэньня ў тых цяжкасьцях, якія стварылі самыя паўночна-рускія князі... У Яраславічаў праблісківалі часамі хаця нейкія ідэі аб старшынсьцьве, сваяцтве й праве. Затое ў Усевалодзічаў гэтага ня бачна. Яны забыліся аб сваяцтве й таму не шанавалі яго, дык і ня ведамае было ім спачуцьцё. Для прыкладу, Юры Маскоўскі, калі прыехаў у Арду, дык сваімі паводзінамі й сваім «бесчувствіем» у дачыненьні да зьнявечанага трупа Міхала Цьверскага, які валяўся голым каля палаткі, выклікаў «возмущение» навет у Татараў. Толькі постаць кн. Аляксандра Неўскага да пэўнае меры прыкрывае той «ужас одичания и братского озлобления. В опустошеном общественном сознании оставалось только место инстинктам самосохранения и захвата».

Калі-б ім былі дадзеныя магчымасьці жыць самым сабе, дык яны разьнясьліб сваю Русь на дробныя кусочкі, якія бязупынна глуміліся-б адзін над другім. Але вось княствы паўночна-ўсходняе Русі былі не самастойныя гаспадарствы, а «даннические улусы» Татараў. Князі паўночнае Русі называлі сябе «холапами вольного цара», бо гэтак тады Расейцы называлі ордынскіх ханаў. Улада гэтыхжа ханаў давала хаця «призрак единства» для стала «отчуждавшимся» удзелам расейскіх князёў. Уладзімерскі вяліка-князяўскі пасад быў прадметам гандлю, а куплены ханскі ярлык пакрыў усякую няпраўду. Аднак пакрыўджаны не хапаўся адразу за аружжа, каб адпомсьціць, але ехаў да татарскага хана, шукаючы справядлівасьці, і трэба сказаць, што там яе часта знаходзіў. А таму гнеў хана й страх перад ягоным абліччам паўстрымоўвалі забіякаў. Дык і нездарма расейскія летапісы называюць Татараў «батогом Божим, вразумляющим грешников, что-бы привести их на путь покаяния».

Вось гэтак пісаў расейскі гісторык праф. Ключэўскі аб расейскім народзе й аб Татарах, а таму ня дзіўна, што маскоўскае грамадзтва, будучы ўзгадаванае на адпаведнай традыцыі «ужасе одичения», глядзела на вайну з вольным Ноўгарадам, як на магчымасьць атрыманьня свабоды сваім затаеным і «преследуемых татарами инстинктов». Гэтае маскоўскае грамадзтва, вызваліўшыся пры Іване III-ім ад «волного цара», ад татарскага «батога», а разам з гэтым і ад «Божего батога», зажадала стаць самое «батогом» для Усходняе Эўропы. Што датычыцца «маскоўскіх інстынктаў», дык Вы пабачыце, што гэта хаваецца пад словам «инстинкт», калі расказваць буду аб паходзе Масквы на Ноўгарад. Аднак раней, чымсьці прыступіць да апісаньня паходу, я змушаны затрымацца над некаторымі мамэнтамі й у колькіх словах іх апісаць.

У пачатку травеня 1471 г. Іван склікаў адумысловую ваенную нараду, каб абгаварыць пытаньне, калі выступіць у паход. Прабег гэтае нарады ня ёсьць ведамы, але затое ёсьць ведамая пастанова, што трэба неадкладна нанесьці ўдар па ноўгарадзкай рэспубліцы; таму не адкладаць на зіму, але ісьці зараз-жа ў паход. У гісторыі Ноўгарада ня сустраканы выпадак, каб вораг важыўся пачынаць ваенныя дзеяньні ўлетку, а гэта таму, што Ноўгарад распаложаны сярод непраходных лясоў і заросьляў, якія прарэзаныя сотнямі рэчкаў і ручайкоў, а галоўнае, што акружаны быў мноствам вазёраў з балатамі. Такім чынам ваяваць улетку лічылі, што ёсьць вялікае рызыка й загадзя трэба падрыхтавацца на няўдачу. Дзеля таго й паўстае запытаньне, чаму Масква наважыла чачаць вайну ў такую пару, улетку?

Я мяркую, што асноўнымі прычынамі былі:

1) Вялікі князь Казімер, пасылаючы літоўскае пасольства з кн. Міхалам Алелькавічам у Ноўгарад, амаль адначасова паслаў пасольства ў Залатую Арду, да цара Ахмата з тым, каб Ахмат заатакаваў Маскву ад паўдня, што дало-б магчымасьць расшчапіць кулак маскоўскае мілітарнае сілы.

2) Ноўгарадзкія патрыёты зьвярнуліся з просьбаю да Лівонскага Ордэну ў справе дапамогі, а Магістар Лівонскага Ордэну выслаў адумысловае пасольства да Магістра Тэўтонскага Ордэну з запытаньнем, што рабіць.

3) Ня было пэўнасьці, куды далучыцца Пскоў, бо раньняй вясной, калі ўзаемадачыненьні паміж Ноўгарадам і Масквой завайстрыліся й калі ноўгарадзкае пасольства прыехала ў Пскоў, каб «вы бы есте за нас против великого князя на конь оуссели по своему с нами миродокончанию», дык пскоўскае веча пасьля нарадаў гэткі адказ Ноўгараду дало: «как вам князь великой отслет возметную грамоту, тогда нам явите; а мы о том огадав вам отвечаем». Тут ясна відаць, што Пскоў быў пастаўлены ў даволі прыкрую сытуацыю, ён ня ведаў, што рабіць, ён меў жаль да Ноўгараду, але прадчуваў, што з заваёваю Ноўгараду прыйдзе чарга на Пскоў. Стаць адкрыта, рашуча выступіць на баку Ноўгараду супраць Масквы ўважаў, што сілы іх будуць за слабыя й можна ўжо страціць сваю незалежнасьць. Таму прыглядаўся, прыслухоўваўся, вывучаў абставіны й падрыхтоўку Літвы, дык і даў адказ Ноўгараду.

4) У Маскве трубілі аб зрадзе Ноўгараду Праваслаўнай Царкве, а таму надавалі вайне характар крыжовага паходу. У Ноўгарадзе вырашана было паслаць Уладыку Фіафіла на пастаўленьне ў Маскву, ды навет на «опас» езьдзілі да Івана, дык калі-б Ноўгарадцы пасьпяшылі, а не адкладалі справы хіратоніі свайго Уладыкі, то змусілі-б маскоўскую прапагандовую трубу, Маскоўскага мітрапаліта Філіпа, замаўчаць, а гэта было якраз не пажаданым Маскве.

5) Раньняй вясной 1471 г. Ноўгарад паслаў свайго кормленьніка-князя Васіля Шуйскага ў Завалача быццам-бы для абаронных мэтаў, спадзяючыся, што туды будуць кінутыя аддзелы маскоўскага войска. Аднак можна рабіць тут такое дапушчэньне што кн. Шуйскі быў пасланы з Ноўгараду вылучна не з абаронных меркаваньняў, але, сабраўшы адпаведныя сілы (згодна маскоўскага летапісу ён меў 12 000 асоб у чэрвені) выйсьці каля Усьцюга й заатакаваць Маскву ад паўночнага-ўсходу, на лініі Галіч—Валогда.

6) Паколькі Ноўгарад зьвярнуўся да Літвы з пажаданьнем увайсьці ў склад Вялікага Княства Літоўскага й быў апрацаваны праект дагавору й згодна параграфу першага гэтага дагавору Літва мелася абараняць Ноўгарад, дык аснаўны ўдар меўся быць з боку Літвы. Вось-жа вялікі кн. Казімер пачаў перамовы з Рымам, каб Папа звольніў каталіцкае духавенства ў Ліцьве й Польшчы ад падаткаў, а такім чынам сабраць адпаведныя сумы грошаў на ўкамплектаваньне арміі.

Я не сумляваюся, што ў Маскве, калі не ў дэталях, дык у вагульным зарысе ведалі аб заплянаванай кааліцыі й падрыхтоўцы. Таму на травеньскай ваеннай нарадзе стаялі перад дылемай, што трэба рабіць, каб не дапусьціць да задзіночаньня варожых сілаў? Адлажыць паход на Ноўгарад да зімы, як гэта рабілі дзяды, гэта значыла даць ворагу час на акружэньне Масквы з усіх бакоў. Іван добра разумеў сытуацыю, у якой апынуўся, а таму трэба было ня трацячы часу адным ударам пакончыць свайго галоўнага ворага — Ноўгарад. Ліквідуючы Ноўгарад, ён наводзіў псыхалягічны страх на тых, хто быў хісткі й ненадзейны, што ня маюць яны чаго аглядацца на дапамогу аднекуль і няма чаго заляцацца зь Літвой, бо толькі Масква мае сілу й на яе трэба арыентавацца. Дзеля таго трэба было дзеіць хутка й рашуча.

(Працяг будзе)

Міхась Белямук

АБАВЯЗКАМ КАЖНАГА БЕЛАРУСА ЁСЬЦЬ ЧЫТАЦЬ, ПАШЫРАЦЬ І ПАДТРЫМЛІВАЦЬ «БАЦЬКАЎШЧЫНУ».

«Амэрыка, прачніся!»

(Заканчэньне з 2-ой бач.)

ючы яго, дзе трэба, у межах паміж гарачым аптымізмам і чорнай роспачай. Мы шчасьліва ўздыхаем, калі Крэмль пастановіць зьменшыць тэмпэратуру, і кідаемся ў страх, калі яна падымаецца зноў. Кажная зьмена зьдзіўляе нас нанова — і нанова кідае нас у зьбянтэжанасьць. Мы сталіся трагікамічнымі марыянэткамі, прыводжанымі ў рух нітка мі, заціснутымі ў касматых кулаках Хрушчова.

У той час, як гэта ў вялікай ступені параліжуе магутнасьць Захаду, камуністыя зьбіваюць сабе вялікі палітычны капітал гэтымі хвальшывымі надзеямі, якія яны выклікаюць у заплянаваных інтэрвалах. **Прыкладам, у пэрыядзе перад парыскай катастрофай на найвышэйшым узроўні, яны схілілі ўрад Задзіночаных Штатаў выняць апошнія хісткія зубы зь перадачаў, скіраваных да народаў Савецкага Саюзу, выкінуўшы слова «Вызваленьне», тарнаванае ў дачыненьні да паняволеных камунізмам народаў. Прычына гэтага — «каб не**

ХОЧАШ ЗРАБІЦЬ СВАЙМУ БЛІЗКАМУ ПРЫЕМНАСЬЦЬ І АДНАЧАСНА КАРЫСЬЦЬ ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ СПРАВЫ, ПАДАРУЙ ЯМУ КАМПЛЕКТ КНІЖАК

ВЫДАВЕЦТВА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»

псаваць прыязнай атмасфэры» і «не раздражняць» савецкіх кіраўнікоў. Але выглядае, што ніхто не падумаў, як можна не раздражняць сьмяротнага ворага, адзіная мэта якога — цалкам вас зьнішчыць!? (Падкр. наша. — Рэд.).

Або гляньма на фантастычны спэктакль падарожжа па Амэрыцы Хрушчова — на гэты прапагандовы трыюмф для сусьветнага камунізму й вялізарны ўдар па антыкамуністычных сілах ува ўсім сьвеце — ці-ж гэта ня было сусьветным рэкордам у бескарысным фліртаваньні з дэспатам? Дыктатар, цэлае жыцьцё якога было й будзе прысьвечанае зьнішчэньню ўсіх людзкіх правоў, так дарагіх вольнаму сьвету, быў вітаны, як быццам-бы ён быў ветлым голубам міру. Наколькі мы можам быць лёгкавернымі?

Гэтая страшная й фатальная камэдыя будзе працягвацца да таго часу, пакуль вольны сьвет, на чале з поўнай рашучасьці Амэрыкай, не прачнецца і не пабачыць бязьлітаснай рэчаіснасьці халоднай вайны, пакуль не пакіне адыгрываць джэнтэльмэнскай абароннай ролі і не пачне агрэсыўна змагацца супраць камуністых іхнымі-ж уласнымі сяродкамі. Доктар Робэрт Страўс-Губэ, які прааналізаваў камуністычнае разуменьне «працяглага канфлікту», піша: «Для камуністых няма разнаякіх відаў вайны — халоднай ці гарачай. Ёсьць толькі адна вайна — **вайна да канца.»**

У гэтай бесьперапыннай вайне камуністыя ўжываюць усю і ўсякую зброю — ад прапагандовых лістовак да збройнай сілы, ад сабатажу й забойства да ўсьмешак і паціскаьня рук. І яны **заўсёды** ў афэнзыве. Той факт, што вольны сьвет увесь час быў на абаронных пазыцыях, зьяўляецца прычынай няверагоднай хуткасьці, зь якой чырвоны вораг здолеў паняволіць адну трэйцюю людзкога роду. Мы заўсёды і ўсюды дазвалялі камуністым пераймаць ініцыятыву, выбіраць поле бою, аб'екты й навет зброю. Контракцыя вольнага сьвету заўсёды была імправізаванай у выніку гэтых заўсёды нечаканых нападаў, і таму была няпэўнай і навет панічнай. І так кажны раз мы абмяркоўваемся абаронай пэўнай загрожанай пазыцыі; у выніку мы ўважаем за посьпех, калі захоўваем толькі тое, што мы мелі дагэтуль. І выглядае, што мы згадзіліся з ганебнай ідэяй, што калі мы толькі будзем трымацца за тое, што выразна і паводля права нашае, у той час, як камуністыя заграбаюць усё іншае — мы маем посьпехі такія, якіх толькі можна было чакаць...

Мы йдзем ад аднаго крызісу да другога — і кажны зь іх носіць этыкетку «прадукт СССР». Мы імчымся ад аднаго пункту зямной кулі да другога, і заўсёды ў час і месца, выбранае саветамі. Калі мы вядзем перамовы, дык гэта бязьзьменна заўсёды аб нечым, што камуністыя наўмысна стварылі для прапагандовых мэтаў, каб мы заўсёды былі разгубленымі: абтокі Матсу-Квэмой, Заходні Бэрлін, ядзерныя выпрабаваньні, раззбраеньне. Мы-ж ніразу не паднялі агрэсыўна тых пытаньняў, якія прымусілі-б камуністых абараняцца. Калі-ж хісткія дзяржаўныя кіраўнікі заходняга сьвету ўсьвядомяць сабе, што халодная вайна — гэта **запраўдная вайна,** і што, як здараецца ўва ўсіх войнах, мы напэўна прайграем, калі мы не пачнем афэнзывы?

Адзіным тлумачэньнем гэтай бязьдзейнасьці мусіць быць нашая няздольнасьць зразумець **навет цяпер** запраўднага характару камуністычнай пагрозы. Але-ж хіба ўсім павінна быць зразумела, што Масква й Пэкін маюць адну цьвёрдую мэту — стварэньне камуністычнага сьвету — і старанна распрацаваную стратэгію дзеля дасягненьня гэтай мэты. Яны ведаюць, што яны знаходзяцца ў стане працяглай вайны. Яны ведаюць, што застаючыся камуністымі, у іх няма іншага выбару як толькі перамога ў гэтай вайне. З другога боку, мы, толькі выстаўляючы нашу варту на сэрыі паасобных абаронных аб'ектаў — ня маем азначанае мэты, апрача надзеі на прыймальнае замірэньне, якое дазволіла-б нам займацца нашымі штодзённымі справамі безь няпрыемных замінак.

(Працяг будзе)

Карлёс П. Ромулё

Бяз дум і без мазгоў, вы — золата бяз
звону.

З усіх бакоў на послугі уціску
Чаргою воўчаю зьяўляецеся ўсюды,
Дзе клічуць вас для крыўды, для націску
На праўду вечную... Вы... вам імя Юды!

Ідзеце-ж проч! Бясплодна ваша трата
На ласкі лісьсія. Пакінце слова: «брат»!
Вы — цяжкі сон. Вы — каты... горш за
ката!
Кругом праклятыя, вам бацька, брат —
дукат!

ПЕСЬНЯ-ЗВОН

Гэй, ты, маці, родна мова,
Гэй, ты звон вялікі, слова,
Звон магучы,
Звон бліскучы,
З срыбра літы,
З злота зьбіты,
Загрымі ты,
Загрымі!
Гэй, званар, званар, мой пане,
Бі у звон, як змогі стане,
Без спачынку,
Бяз упынку,
Потам зьліты,
Ім умыты, —
Бі, звані ты,
Бі, звані!
Гэй, гусьляр, пясьняр, мой браце,
Грай, сьпявай у полі, ў хаце,
Дзе гарота,
Дзе галота,
Дзе нясыты,
Дзе няўмыты, —
Ім спыні ты,
Жаль спыні!
Струны хай грымяць і рвуцца
З болю, з гневу; хай сьмяюцца
Разам зь імі,
Ня чужымі, —
Голас чысты,
Залацісты,
Зь імі зьлі ты,
Зь імі зьлі!..

1912

* * *

Я. Коласу

Усе з аднэй мы выйшлі нівы,
І сейбіт нас адзін кідаў,
І кажан з нас той дзень шчасьлівы
Ў сваёй душы багаслаўляў.

А вецер быў. І хто цяжэйшы,
Застаўся там, куды упаў,
А хто, як я, хто быў лягчэйшы,
Ў далёкі сьвет павандраваў.

Бо Сейбіт ёсьць другі на небе,
Што судзіць нам гады і дні, —
І ты узрос на роднай глебе,
Пусьціў глыбока карані.

Здалеў, браток, на сьвет прабіцца
Спраміж сьвірэпкі і асок!
І можам мы табой гардзіцца,
Прыгожы, слаўны Каласок.

Цьвіці-ж, расьці, буйней н дзіва
Ў сям'і прыгожых васільк ў, —
З тваіх зярнят хачу, праўдзіва,
Пабачыць поле каласкоў.

ПЕСЬНЯ

На чужой староначцы
Заняпаў душой, —
І згубіў здаровейка
І згубіў спакой.
Не глядзелі-б вочанькі
На нялюбы сьвет,
Маладое радасьці
Прападае сьлед.

На чужой староначцы
Ня цьвітуць сады,
Не сьпяваюць птушачкі, —
Не лятуць сюды.
І чужое лецейка
Для мяне — зіма,
І чужога сонейка
Для мяне няма.

На чужой староначцы
Ня шумяць лясы,
І няма прыгожасьці
Ў палявой красы.
Замірае душачка
На чужой зямлі,
А дамоў вярнуціся
Не ў маёй валі.

Дзе-ж вы, ніўкі родныя,
І дубовы шум?
Засьпявайце голасна,
Каб пазнаў, пачуў.
Скаланеце песьняю
Векавечных сноў,
Скаланеце душачку,
Скаланеце кроў.

На чужыне

У ВЫГНАНЬНІ

Край чужы — за веру кара, —
Сьнег, мароз ды горы.
Белы сьвет, як чорна хмара,
Заступілі горы.

Край чужы... І ты чужынец,
Усім ня свой здаешся:
Ходзіш скрозь, як той адзінец
Старакосны ў лесе.

Ходзіш ты, ніякай мэты, —
Так, — абы цягацца,
Знаць сабе: жывеш яшчэ ты...
Для чаго-ж, спытацца?

Хто цябе спагадным сэрцам
Да сябе прытуле?
Хіба з стрэльбы чужаверца
Чужаніца-куля.

Хто цябе спытае міла,
Ў дом папросіць гожа?
Хіба дол, адно — магіла
Разгарнуцца можа.

Што з таго — часамі сьніцца
Край, дзе ты радзіўся?
Толькі мусяць сьлёзы ліцца, —
Лепш-бы і ня сьніўся!

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Сёе-тое

(Заканчэньне зь 1-ай бачыны)

Беларусы ў Канадзе ёсьць. Маюць свае дамы й цэрквы, арганізацыі й добрае імя. Аб іх Брыль не напісаў. Небясьпечна. Затое-ж усюды намагаецца прымазаць Беларусаў да тых-жа «прагрэсывістаў». Была іх там добрая жменя, але расплыліся. Некаторыя, хоць нешматлікія, да беларускіх нацыянальных арганізацыяў вярнуліся, а тыя, што ўгнаеньнем для чужых сталіся, ніводнай арганізацыі беларускім іменем не назвалі. І дзякуй Богу, што беларускага імя не апаскудзілі.

Ды знайшоў Брыль Грышку, што ў Тароньце камуністычны «Вестник» выдае. Гэта-ж ня хто іншы, як Грышка Акулевіч, зьведаўшы ў 1948-м годзе родную Кракотку ў Беларусі й побачыўшы жахлівую галечу суродзічаў пад прыгонным бальшавіцкім рэжымам, вярнуўшыся ды апавядаючы пра гэта свайму земляку Засімовічу, ручаямі сьлёзы лў. Адылі гэты двутвары бобік і сяньня пры «Вестнику» ліпіць...

Шкада й слоў...

✳

Вэрган НКГБ для прыманьваньня беларускіх эмігрантаў у бальшавіцкую пастку, «Голас Радзімы», перанёсшыся з Бэрліну ў Менск, сканцэнтраваў як выглядае, свае стрэлы ў двух кірунках: першы — дэмаскаваньне гэтак званых «злачынцаў» супраць беларускага народу за межамі й другі — кіданьне сьвятла на тое, як жывуць і як каюцца ці ўжо пакаяліся быцьцыя «злачынцы», што сяньня жывуць пад бальшавіцкім прыгонам і якім «гуманная радзіма» шчыра й вялікадушна» даравала.

Калі мэтай «Голасу Радзімы», а дакладней гаворачы, НКГБ й людзей пад ягоным загадам, што выдаюць гэты лісток, ёсьць прыцягваньне «блудных сыноў» дадому, дык варта было-б ім пазбыцца дзіцячай нясьмеласьці й узяць на ўвагу занядбаны трэйці кірунак: рэгулярна друкаваць біяграфіі вядучых «доблестных сыноў» беларускага народу, што сяньня сядзяць за рулём. Можна было-б пачаць ад «акадэміка» Гарбунова, пасьля спыніцца на Мазураву, Гурскім і іншых, што сядзяць на сьвятле і ў ценях. Маем наўвеце біяграфіі запраўдныя, а не казённа-прапагандовыя. Такія, зь якіх «блудныя сыны» даведаліся-б, хто зь іх і колькі народу выдушыў, можна было-б паднесьці заслону агульнай бальшавіцкай кансьпірацыі ў Беларусі й шмат іншых ягадак. Матачкі мае, вось і цікава было-б чытаць. Можа нашы суродзічы з гэтага боку акіяну так іх пакахалі-б за гэта, што не самалётамі, а ракетамі назад у ярмо паляцелі-б...

Землякі гэтыя, бачыце, тут ужо прыхварэлі крышку. Недаверлівыя. Пакуль каго дзе выбяруць у мясцовыя ці дзяржаўныя ўлады, дык ня толькі праграмы, але й што навет жонка ў кухні вырабляе, хочуць ведаць. Гэта кандыдаты на паслоў прыходзяць на іхныя грамадзкія залі, на ўсе пытаньні адказваюць, чарку разам, бывае, перакуляць, ды і ўсякую дапамогу суляць. Ну, а як нядаўна Мазураў на Асамблеі ЗН заявіў, што ў Беларусі рэгулярна адбываюцца самыя вольныя й найбольш дэмакратычныя выбары, дык чаму-ж тады, таварышы завяртанцы, не пачаць вам расказваць праўды пра тых, якіх вольны й шчасьлівы народ з году ў год даверам надзяляе? Былі-б адразу дзьве карысьці: вы праславілі-б заслужаных, а тут мо хто і з-за акіяну вярнуўся-б.

Ну дык, гайда! Давайце!

✳

Пад загалоўкам «Такім радзіма не даруе», «Голас Радзімы» за верасень у № 67 прысьвячае паўтары бачыны гэтак званаму «народнаму суду», што адбыўся ў Грэску над быўшымі паліцаямі. Іхныя прозьвішчы: Ілясаў, Елішэвіч, Бурак і Цябус. Энкагэбаўскі лісток аж захлынаецца ад злоснага шалу, прыгадваючы тыя злачынствы, што быццам вышменаваныя зрабілі над народам у Случчыне за час гітлераўскай акупацыі. Хіба люнатык пярэчыў-бы, што між паліцаяў была маса крымінальнага элемэнту таксама, як і між бальшавіцкіх партызанаў. І адны й другія зрабілі нашаму народу цяжкія да загаеньня раны. Найбольш пікантна, што адны крымінальныя судзяць другіх, а народ побач адно як нямы ўдзельнік.

Адзін наш добры сябра паходзіць з Грэска. У часе вайны быў дома й каля дому й ня быў у паліцыі. Прыглядаўся з боку й добра памятае людзей ды што хто вырабляў. Паводля яго лік грэскай паліцыі ў часе апошняй вайны дасягаў да 350 чалавек. Камендантам быў нейкі Украінец Купа, што меў у ваддзеле й двух сваіх братоў. Гэтая тройка, ды Ілясаў і Елішэвіч былі балючым струпом, што разьядаў падчас вайны цела слаўнай беларускай Случчыны.

Купа загінуў ад кулі сваіх-жа людзей у трыццатай дывізіі на фроньце пад Бэзансонам у Францыі напрыканцы 1944-га году. Доля ягоных братоў няведамая.

Прысьвяціўшы столькі месца злачынам Ілясава й Елішэвіча, «Голас Радзімы», відаць наўмысьля, забыўся прыгадаць, што гэтыя, пакараныя сьмерцю цяпер у Грэску, калішнія злачынцы, былі Расейцамі. Ленінградзец Ильясов і няведама зь якой масцовасьці паходжаньня Елишевич, уцёкшы зь нямецкага палону, былі прыпіснымі жыхарамі ваколіцаў Грэска. Добрыя случчакі ня ведалі, якіх цнотак прыхінулі на сваім улоньні. За гэта дорага пасьля заплацілі.

Калі-б «Голас Радзімы» быў запраўдным голасам прыгнечанага беларускага народу, то не захістаўся-б прыгадаць, што гэтыя два найбольш нялюдзкія паліцаі былі Расейцамі. У нас хапае сваіх выродкаў, вунь пачаўшы хаця-б ад цяперашніх на вярхушцы. Навошта яшчэ чужых прыдзяляць Беларусам?

Але, відаць, «старэйшага брата» можна адно хвалець, а ніколі ганіць. І ці-ж не дарэчы пры гэтым прыгадаць, што Радыёнаў і Камінскі, што нішчылі, палілі й страляллі наш народ, як шырокая й даўгая Беларусь, таксама былі Расейцамі? Ёсьць сяньняшнім прыслужнікам Масквы ў Беларусі чым пахваліцца, што й гаварыць...

ПАДЗЯКА

Паваж. Спад. Рэдактар!

Дазвольце праз Вашую газэту выказаць маю шчырую падзяку а. Сьцяпану Войтэнку, харыстым, прыяцелям і знаёмым, якія прысутнічалі на паховінах мае дарагое і любімае мамы, сьв. пам. Надзеі Мароз.

Асаблівую падзяку выражаю сп-ні М. Ханяўчысе за яе бязінтэрасоўную помач і дагляд, аказаны маёй маме ў вапошнія дні ейнага жыцьця, а таксама сп-ні З. Дубяжысе за помач у прыгатаваньні вячэры і ўсім іншым, прыслаўшым краскі або ахвяраваўшым грошы ў памяць мае мамы на выдавецкі фонд «Бацькаўшчыны».

З пашанай **Др. Галіна Сокал**

✳

Абвесьціў быў« Голас Радзімы» колькі месяцаў таму назад конкурс на найлепшы твор «суайчыньнікаў» з-за мяжы. Тэма? Дакладна ня памятаем, бо ня зьбіраліся пісаць. Нешта там з радзімай зьвязанае. І вось у нумары 70-м за селетні верасень «З матэрыялаў, дасланых на конкурс» знаходзім дыямант — адгадайце каго... далібог не ўгадаеце: Міхася Кавыля.

Чытаем зь недаверам. Мо якая правакацыя ці што? Не. Стыль і прыёмы згаджаюцца. У памяці вырастае «тварэц», што ў «Міжагнёў» і Астроўскага на трыбуну ўзьвёў і што так шматлікае беларускаму народу, акрамя сваей поўнай адданасьці, ня раз суліў...

«Грэх на сэрцы цяжкі» — кажа сяньняшні жыхар з-над Гудзону. І перад кіж-жа гэта грэх? Народам нашым ці ягонымі крывапіўцамі? Дамо слова аўтару:

«Ня дурыся, — казала мне маці, —
Будзь заўсёды з народам, сынок».
І паслала усьлед мне пракляцьце,
Калі з дому, як злодзей, уцёк,
Баючыся расплаты за здраду,
Чорных спраў баючыся сваіх;
Меркаваў — людзі зробяць засаду
На мяне і на вершы маі.

На чужыне і душна, і цесна,
Вязьне ў горле «заморскі калач».
Чую сьмерць у маўчаньні злавесным,
О, прабач мне, Радзіма, прабач,
Пашкудай свайго блуднага сына,
Што пакінуў твае рубяжы.»

Чулі? Камэнтары хто-небудзь? Ці-ж гэта не пачатак «девяти девятерей» да пакаяньня? Сумленьне, гонар, мараль, чалавечае аблічча? Цьфу...

Міхась Козыр

Зь беларускага жыцьця

СПАДАР ПЁТР КОНЮХ У ЛЁС АНДЖЭЛЕС

У суботу 12-га лістапада сёлета Беларусы ў Лёс Анджэлес мелі рэдкую прыемнасьць спаткацца із сп. Пётрам Конюхам — з нашым шырока ведамым і дарагім сьпеваком, які праездам быў затрымаўшыся тут на некалькі дзён у гатэлі Гэйвард. Адразу хацелася гасьціць вельмі паважанага артыстага й мастака беларускай песьні першы раз у сябе дома, але, нажаль, прышлося падпарадкавацца цьвёрдай волі сп. Конюха й быць ягонымі гасьцямі.

Гутарка пры абедзе прайшла хутка ў вельмі мілай атмасфэры. Сп. Конюх расказваў сваім новым знаёмым суродзічам шмат чаго цікавага із свайго жыцьця й падарожжа па сьвеце зь песьняй. Каліфорнія яму спадабалася, і ён абяцаў, на разьвітаньне, завітаць сюды яшчэ ў наступным годзе.

Будзем надзеецца, што наступны раз у сп. Конюха будзе даволі часу, каб пазнаёміцца зь Беларусамі ў Каліфорніі шырэй і бліжэй. Яшчэ раз шчыра жадаем яму ўсяго найлепшага!

Ю. Н.

СЯБРОЎСКІ ВЕЧАР У ТАРОНЬЦЕ

У сыботу 19-га лістапада сёлета ў вялікай залі Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Цэнтру адбыўся сяброўскі вечар. Гэта штосьці новае. Да гэтага часу адбываліся там адно вечарыны, асноўнай мэтай якіх быў грашовы даход ды й прынагодныя рэлігійныя ці нацыянальныя сьвяты. Актыў наш пераважна пры такіх нагодах працуе, закасаўшы рукавы, ня маючы часу забаўляцца. Як-бы там ня было, даўгі не пачакаюць, іх трэба сплачываць.

Але й актыў часамі хоча адпачыць, а пры гэтым мо што й карыснае заадно зрабіць. Дык і наважылі зрабіць сяброўскі вечар. Было запрошана добрая жменя людзей. Пры нагодзе былі й госьці зь Лёндану й Садбуры. Была музыка з кружэлак, смачныя, падрыхтаваныя сп-няй Грыцуковай закускі (вялікае дзякуй ей за гэта!), ну й, ясная рэч, напіткі. Прысутныя танцавалі й вясёла праводзілі час.

Увесь гумар, калі яго так можна назваць, складаўся з чытанага сп-ром К. Акулам фэльетону ды й ягонай імпэрсанацыі — адгадайце каго... самога Міхіткі Сяргеевіча Хру... — Ну й «рэчуху-ж» адкаціў, — жартавалі пасьля слухачы. Сьціпла гаворачы, сьмеху было даволі, ды й чаравік быў у рабоце.

Падсумоўваючы, як на першы раз, было нядрэнна. Ужо чуваць адгалоскі, што будзе такіх вечароў больш, ды й іншыя маняцца браць у праграме ўдзел. Памажы Божа! Можна вясёлае спалучыць із карысным, бо пры нагодзе й кароценькі рэфэрат на якую актуальную тэму зрабіць.

ІМЯНІНЫ АЙЦА МІХАІЛА

У нядзелю 20-га лістапада, пасьля Сьв. Літургіі, адбыўся ў залі БРГЦ ў Тароньце абед, наладжаны управай парахвіі Сьв. Кірылы Тураўскага, для ўшанаваньня імянін айца Міхаіла (дзень Архістратыва Міхаіла выпадаў у панядзелак). Быў супольны абед, добра падрыхтаваны сп-ром Кавалём. Айцец Міхаіл атрымаў скромны падарак. Ад імя вернікаў гаварыў сп-р д-р Б. Рагуля, што выразіў сьвятару вялікую ўдзячнасьць за ягоную службу Богу й беларускаму народу, а хор прасьпяваў «многае лета». Айцец, мо як няшмат іншых сярод нас, запраўды заслугоўвае на гэтае «многае лета», бо ягоная адданасьць Богу, нашай сьвятой БАПЦ, беларускаму народу ды й мясцовай калёніі амаль ня ведае межаў.

Дай Божа Вам, а. Міхаіл, запраўды многа шчасьця й шмат год!

М. К-р

СЬВЯТКАВАНЬНЕ ГАДАВІНЫ СЛУЦКАГА ПАЎСТАНЬНЯ Ў МЮНХЭНЕ

У нядзелю 27-га лістапада сёлета беларуская калёнія ў Мюнхэне ўрачыста адзначыла 40-ую гадавіну Слуцкага паўстаньня. А 3-яй гадз. папаўдні ў вадным зь нямецкіх касьцёлаў гораду адбылася Божая Служба й Паніхіда за паўшых гэрояў за дзяржаўную незалежнасьць Беларусі, якія адправіў і сказаў пры гэтым глыбока патрыятычнае казаньне ксёндз Уладзімер Салавей.

Пасьля Божае Службы ўсе прысутныя сабраліся ў залі рэстарану «Марыяндль», дзе старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Нямеччыне сп. Уладзімер Бортнік у кароткіх словах падчыркнуў гістарычнае значаньне й нацыянальную важнасьць гэраічнага Слуцкага Чыну. Пасьля гэтага ў мілай сяброўскай атмасфэры адбываліся гутаркі на бягучыя беларускія тэмы.

СПАРТОВЫЯ ЗМАГАНЬНІ

У пятніцу вечарам 18-га лістапада Аддзел Згуртаваньня Беларускае Моладзі Амэрыкі ў Нью Ёрку наладзіў сяброўскія змаганьні ў валейбол і пінг-понг із Згуртаваньнем Польскае Моладзі («Зьвёнзэк Млодзежы Польскей» — ЗМП). Вынікі змаганьня былі наступныя:

Валейбол

ЗМП	ЗБМА
9	15
15	10
15	13

Выйграла польская моладзь — 2:1.

Пінг—Понг

Мячыслаў Коньца ЗМП — Аўген Лысюк ЗБМА — 16:21; 21:16; 17:21; (1:2).
Язэп Галіноўскі ЗМП — Вінцэнт Паланевіч ЗБМА — 20:22; 16:21; (0:2).
Ігаль Зісковіч ЗМП — Павал Алексы ЗБМА — 11:21; 24:26; (0:2).
Зьбігнеў Сьверкош ЗМП — Коля Александровіч ЗБМА — 21:11; 21:18; (2:0).
Ян Груцышын ЗМП — Міхась Казьлякоўскі ЗБМА — 11:21; 21:15; 21:19; (2:1).

Выйграла беларуская моладзь — 3:2

Пасьля турніру сяброўкі ЗБМА запрасілі ўсіх спартсмэнаў на пачастунак кавай і пячывам.

Міхась Паляшук

Замест фэльетону

Адказ
Карэспандэнту „Бацькаўшчыны ў Аўстраліі

Вельмі Паважаны Спадар!

Прабачце, што так зьвяртаюся да Вас. Мусіў-бы напісаць «сябра па пяру», але, бачыце, я пішу звычайна алавіком і, ня ведаючы, чым Вы пішаце — не адважваюся пісаць «сябра па алавіку» — можа быць нелягічнасьць. А гэтага сакрэту, чым пішаце Вы ў сваім адкрытым лісьце нам ня зрадзілі. Аднак мы, Беларусы ў Бэльгіі, рэспэктуем усе прафэсыйныя сакрэты й таму аб Вас абсалютна нічога дрэннага ня думаем. Мне, што праўда, асабіста не падабалася, што Вы й мяне ўсадзілі ў вагульны эўрапэйскі пучок, бо што зь іншымі гэтак зрабілі — мяне зусім не абыходзіць. Але гэта толькі паміж іншага і з-за ўсялякіх дробязяў сварыцца ня будзем.

А зараз Вам крыху інфармацыяў аб Беларусах у Бэльгіі. Як Вы вельмі добра ведаеце, у Лювэне некалі было многа студэнтаў — Беларусаў, якія ня толькі «раўлі», але й многа шумелі аб Беларусі. Бэльгійцы й да гэтага часу ня могуць іх забыць (асабліва собсьнікі кафэяк). Але ўсё мае свой канец. Памалу паканчалі ўнівэрсытэт і кажны працуе — зарабляе на «хлеб насушны», а ў міжчасе новых ня прыбывала.

Мы вельмі многа спадзяваліся з Амэрыкі (заўсёды з Амэрыкі болей спадзяюцца, чым яна можа даць). Некалі й а. Робэрта паслалі туды, каб зрабіў прапаганду, дык прыехала толькі два кандыдаты ці, больш дакладней, адзін кандыдат і адна кандыдатка. І гэтая пара галубкоў не танцуе, не раве, ды і здаецца, як мне суседка пад сакрэтам казала, што й доўгі час не гаварылі паміж сабою.

Болей з Амэрыкі ня прыяжджаюць. Там канчаюць каледжы (і ўяўляюць, што маюць вышэйшую асьвету). Хлапцы зарабляюць грошы, купляюць аўты, а потым шукаюць Беларусак, каб жаніцца, а тыя ў міжчасе выходзяць замуж за Амэрыканцаў, Італьянцаў і іншых «анцаў» — толькі не за Беларусаў. А іншыя зноў нікуды ня йдуць вучыцца, а проста астаюцца шмарусямі.

Але прабачце, я ўжо залез у ня свой гарод. Спадзяюся, што аб гэтым напіша амэрыканскі карэспандэнт «Бацькаўшчыны», калі яшчэ не развучыўся пісаць пабеларуску. Вы, Спадару Карэспандэньце, зрабілі-б таксама прапаганду, каб прыехаў нехта з Аўстраліі на Лювэнскі Ўнівэрсытэт. Дзеля гэтага даю Вам добры аргумант, пастарайцеся яго там выкарыстаць у Вашай прапагандовай кампаніі.

Мой сябра таксама прыехаў з Аўстраліі (магчыма й Вы яго ведаеце). Дык кончыўшы Лювэнскі Ўнівэрсытэт, выглядае як Эўрапэец — на кенгуру зусім не падобны. Праўда ,іншыя кажуць адваротнае, але ня будзем зварачваць увагі на розныя плёткі.

Калі-ж гаварыць наагул аб Беларусах у Бэльгіі, дык гэта прыклад іншым. Дзеці гавораць пабеларуску ня гледзячы, што ходзяць у бэльгійскія школы, дзе вучацца або ў флямандзкай або ў францускай мове. Божыя Службы адбываюцца кажнае нядзелі, праўда, гэта ня ў кажным асяродку, бо мы маем толькі аднаго сьвятара. А як справы стаяць у Вас у Сыднэі, маючы двух (навет трох) сьвятароў?

Беларускія асяродкі ў Бэльгіі значна паменшыліся, бо людзі павыяжджалі ў Канаду й Задзіночаныя Штаты. Але й там вельмі добра спраўляюцца. Напрыклад ў Кліўлэндзе хто найболей улажыў працы пры пабудове царквы, а хто кіруе хорам? — Беларусы, якія выехалі з Бэльгіі. Калі ня верыце — папытайце ў амэрыканскага карэспандэнта.

Вы, Спадару Карэспандэньце, нам паставілі кучу пытаньняў і гэта зразумела —хочацца ведаць усё: як жывуць Беларусы ў Эўропе, колькі іх ёсьць, што яны робяць і што ядуць. Аднак напісаць болей аб Беларусах у Аўстраліі Вы паскромнічалі. А нас таксама ўсё цікавіць. Ці там Беларусы не забыліся яшчэ беларускае мовы ці памалу пераходзяць ужо на сваеасаблівы жаргон, як у Амэрыцы. Напрыклад, ня кажуць «чысьціць пакой», а «клінаваць пакой», ня «ехаць аўтам», а «драйваваць кару» або «я мела ад майго бойфрэнда кол» і г. д. У нас тут паўстае ўжо думка стварыць бюро для перакладаў і расшыфроўваньняў лістоў ад Беларусаў з Амэрыкі.

Вось нядаўна мой сусед прынёс да мяне ліст ад сваячкі з Амэрыкі, каб яму прачытаў. Кажа, ліст пісаны, здаецца, пабеларуску, але ніяк не магу даперці сэнсу. Чытаю, а там дзяўчына пахвалілася, што яна ўжо заручана й яе нарэчаны мае шэсьць ног. Мой сусед пачаў быў ужо выліваць жалі, што такая прыгожая й парадачная дзяўчына й, відаць, зьехала з глузду, бо выходзіць замуж за нейкую амэрыканскую пачвару. Я перарваў ягоную гутарку й растлумачыў, што яе нарэчаны ёсьць шэсьць футаў росту. Мой сусед хацеў вылаяцца, але ўстрымаўся на паўслове — відаць ня выпадала лаяцца пад адрысам сваячкі. Узяў ліст і з палёгкай на сэрцы пайшоў да хаты.

Але вернемся да Беларусаў у Бэльгіі. Я не магу вытрымаць, каб не пахваліцца, што тут Беларусы ня толькі рэгулярна чытаюць газэту «Бацькаўшчыну», але й рэгулярна плацяць за яе, а таксама ўсе зь іх маюць кніжкі Выдавецтва «Бацькаўшчыны». Цікава было-б ведаць, ці Беларусы ў Аўстраліі плацяць хоць за газэту ці й далей чытаюць на крэдыт, а як зойдзеш да іх па грошы, дык ставіць на стол бутэльку віскі й плача, што ня мае грошаў? Ці ў Сыднэі адбываюцца калі-некалі Божыя Службы ці й надалей сьвятар зь гітараю сьпявае «очи черные» ў кабарэце? Ці Беларусы, якія прапануюць быць інтэлігентамі, перайшлі ўжо на «містэр» ці далей зьвяртаюцца адзін да другога на «пане»? Бо я ня думаю, каб яны перайшлі на «спадар».

Гэтых «ці» можна было-б яшчэ многа паставіць, але абмяжуюся пакуль што гэтым. Спадзяюся, што Вы знойдзеце яшчэ крыху вольнага часу й паінфармуеце нас. Уважаю сваім абавязкам сказаць, што Вашая ініцыятыва для інфармацыі чытачоў «Бацькаўшчыны» ёсьць вельмі добрая. За гэта я зьняў-бы перад Вамі капялюх, але хаджу заўсёды з адкрытаю галавою, так што прабачце.

Прымеце, Спадару Карэспандэньце... і г. д. паводля прынятага Вамі шаблёну.

Бэльгія **М. Хацяновіч**

УВАГА! УВАГА!
ПАДПІШЧЫКІ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ» Ў КАНАДЗЕ

Прашу тых, што жывуць па-за Таронтам паведаміць мне, хто хоча атрымаць апошнім часам выданыя кніжкі «Вянок» Багдановіча й «Дабрасельцы» Кулакоўскага, ды й раней выданыя. Сьпіс і цэны кніжак будуць перасланыя на жаданьне.

Усіх падпішчыкаў, залягаючых з аплатаю газэты, прашу аплаціць даўгі.

Пішачы на наш адрас, просім не забывацца стаўляць нумар паштовай акругі «6». Такім чынам адрас будзе:

K. Akula
57 Riverdale Ave.
Toronta 6, Ont., Canada

ПАПРАЎКА

У нумары 46-47 «Бацькаўшчыны», у вершы Натальлі Арсеньневай «Ты не адна» ўкралася друкарская памылка, якая зьніачвае сэнс верша. **Там надрукавана:**

«Было ўсяго у нас: паходаў трубы, горны
баёў, распаленых дачырвана, мячы
нязможныя пад Воршай і мячы
Грунвальду... шлях да мораў торны...
І Каліноўскага
пачын...
Але...
Быў Сакавік... і вал счарнелы целаў
у палынох сівых над Ворскляй...»

А павінна быць:

Было ўсяго у нас: паходаў трубы, горны
баёў, распаленых дачырвана, мячы
нязможныя пад Воршай і мячы
Грунвальду... шлях да мораў торны...
І Каліноўскага
пачын...
Быў Сакавік... Але — і вал счарнелых [целаў
у палынох сівых над Ворскляй...»

БАЦЬКАЎШЧЫНА
Беларускі тыднёвік палітыкі, культуры й грамадзкага жыцьця.
Выдавец: Уладзімер Бортнік

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012